Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 23 (28639)
2 ЛЮТАГА 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



**Ад чаго пакутуюць балоты**

СТАР. 3



**Капітальны рамонт ці мадэрнізацыя?**

МС



**Якім будзе аграпарк у Гродне?**

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Сёння прыватны сектар рэгіёна — гэта 32 тысячы зарэгістраваных юрыдычных і фізічных асоб. У дадзеных арганізацыях працуюць 127 тыс. чалавек — 37 % ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы. Гэта вялікі паказчык. Мы чакаем большай колькасці занятых у прыватным сектары, стварэння новых працоўных месцаў, павелічэння ўкладу ў сацыяльна-эканамічнае развіццё Гродзенскай вобласці. У любой развітой дзяржаве аснова эканомікі — малы і сярэдні бізнес, і мы зараз рухаемся ў гэтым агульным трэндзе. Але трэба памятаць, што з бізнесу не здымаецца і адказнасць за якаснае аказанне паслуг, вытворчасць канкурэнтаздольнага прадукту».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9756 | ▼ |
| Еўра | 2,4507 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0351 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ!

## Асноўная частка беларускіх алімпійцаў адправілася ў Пхёнчхан




Фота БЕЛТА.

Да старту Гульняў-2018 застаецца роўна тыдзень. Напярэдадні ў Пхёнчхане адбылася цырымонія адкрыцця алімпійскай вёскі, у ёй прынялі ўдзел кіраўнік аргкамітэта Лі Хі Бом і прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Карэя Лі Кі Хын. Над алімпійскай вёскай былі падняты сцягі ўсіх краін — удзельніц Гульняў.

СТАР. 3

■ Сацыяльная ініцыятыва

# «ПЕНСІЯ. НЕБА. САМАЛЁТ»

## Беларускія пенсіянеры змогуць падарожнічаць з маладымі валанцёрамі

**У большасці з нас у галаве сядзіць такі штамп: маўляў, еўрапейскія старыя падарожнічаюць і атрымліваюць асалоду ад жыцця, а ў нашых адна радасць — градкі. І гэта на самай справе падобна на праўду, нягледзячы на тое, што сёння магчымасць паглядзець свет ёсць практычна ў кожнага, у тым ліку і ў нашых пенсіянераў, галоўнае — мець такое жаданне і нічога не баяцца. «Усё гэта казкі! — пацісну плячыма скептыкі. — А грошы? А як візу атрымаць? Як размаўляць, не ведаючы ніводнай замежнай мовы?» Маладая мінчанка Марыя Мунцян вырашыла даказаць, што ўсе гэтыя цяжкасці можна пераадолець — і стварыла сацыяльны праект па арганізацыі сумесных падарожжаў пенсіянераў і моладзі.**

СТАР. 5




■ Нерухомасць

# БЮДЖЭТНЫЯ ЦЭННІКІ «ЗІМОВЫХ» ДАЧ

## Спецыялісты адзначаюць, што найменш кошт магчыма «злавіць» толькі ў міжсезонне



**У мінулыя гады эксперты рынку загараднага жылля раілі займацца пошукам такой нерухомасці выключна ў незімовы час. Бадай, раней такая парада была дарэчы: любыя недахопы нерухомасці схаваюцца пад снегам. Але сёлетняя еўразіма стабільным снегам і марозамі нас не цешыць. Так што на календары адно, а на дварэ — амаль вясна. Самы час гаварыць пра цэны на дачы, вырашылі мы і задалі адпаведныя пытанні начальніку аддзела «Дамы. Дачы. Катэджы» агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Алене АКУЛІЧ.**

***— Якая загарадная нерухомасць цяпер карыстаецца папулярнасцю ў пакупнікоў?***

— Існуе памылковае меркаванне, што попыт на загарадную нерухомасць (зямельныя ўчасткі, дачы і жылыя дамы) узнікае ў кліентаў толькі ў цёплы час года, і асабліва вясной і восенню. Але гэта не так. Попыт ёсць заўсёды, проста ў залежнасці ад сезона ён вагаецца па цалкам зразумелых прычынах — загарадныя аб'екты значна камфортней аглядаць, калі цёпла. У той жа час сваім кліентам мы рэкамендуем не чакаць прыходу цяпла, а пачынаць пошукі менавіта тады, калі прымаецца рашэнне аб неабходнасці набыцця.

Па-першае, таму, што ў халодную пару года выяўляюцца ўсе недахопы: дзесьці цячэ дах, дзесьці прамярзае або задзімае, дзесьці падтапляе і г. д. Калі зялёныя насаджэнні без лістоты, то і сам аб'ект успрымаецца больш аб'ектыўна. У той час як увесну і ўлетку эмоцыі ад квітнеючай прыроды могуць схаваць ад вачэй недахопы прапанаванага варыянта.

СТАР. 4